**Алесь Дудар** — „*Сонечнымі сьцежкамі*". Вершы. Выданьне ЦБ „Маладняка". 64 стар. Цана 15 к. 1925 г.

Сучасная наша крытыка і бібліографія, трэба прызнацца шчыра, мала аддае ўвагі зборнікам поэзіі і мастацкай прозы нашых маладых песьняроў і пісьменьнікаў. У гэтай галіне адчуваецца шкодны арыстократызм. Такое становішча ня спрыяе разьвіцьцю маладых талентаў, ня спрыяе поступу да новых дасягненьняў нашаму мастацкаму слову. Асаблівым консэрватызмам у гэтым вызначаецца шаноўная часопіс „Полымя". Ну хоць-бы на адзін № кніжніцы „Маладняк" там было напісана поўслова. Няма. Маўчыць, як вады набраўшы ў рот.

Так вось і з зборнікамі А. Дудара. Вышаў яго першы зборнік вершаў „Беларусь Бунтарская". Ну, дзе і хто аб ім напісаў хоць два радкі? Маўчаньне,—а гэта-ж найвялікшыя моральныя мукі для поэты. Адзін яшчэ крок і ён на творчым раздарожжы. Творы-ж Алеся Дудара не заслужылі на такі трагічны лёс. У іх мы бачым орыгінальнасьць і колёрытнасьць, уласьцівую толькі Алесю Дудару. Яскрава гэта вызначана ў другім зборніку яго вершаў „Сонечнымі сьцежкамі". Вось аб гэтым зборніку і скажам некалькі слоў.

Першае, што кідаецца пры чытаньні зборніку—гэта рознастайнасьць тэматыкі. Усе вершы разьбіваюцца на шэсьць тэматычных цыкляў: Беларусь у мінулым, Кастрычнік, сягоньня, індывідуальныя пераживаньні і настроі, горад і сузор'і. Ня будзем мы тут казаць: ці гэтыя тэмы зьяўляюцца новымі ў беларускай поэзіі, ці не, а толькі адзначым адно: малады наш пясьняр Алесь Дудар падыходзіць да жыцьцёвых праяў і падзей усебакова, з чулым замілаваньнем мастака, дапаўняючы ўсё гэта індывідуальнымі пераживаньнямі і настроямі. Ён імкнецца зьліць у вадну сугучнасьць жыцьцё і сваю істоту, гэта дае нам упэўненасьць, што Алесь Дудар сонечнымі сьцежкамі выйдзе на прасторны сонечны шлях сваёй творчасьці. Ён ужо вызначаецца ў некаторых строфах яго вершаў, як:

І ў нязнанай, цьмянай далі
словаў новых мы шукалі,
Словаў новых мы шукалі
і ня здолелі знайсьці...
А ў жытнёвым у прасторы
рассыпалі песьні-зоры,
Рассыпалі песьні-зоры
каля возера ў трысьці.

Хоць мы тут лірычную композыцыю маем і Бальмонтаўскую, затое адчуваем бесапасрэднасьць і вялікую шчырасьць настрою маладога поэты, такіх вершаў мы ў зборніку маем некалькі. Толькі вось адно мяне дэтануе: у „Сонечных сьцежках“ адчуваецца падвойнасьць душы і настрояў поэты. Так, у вадным вершы ён верыць, што

Мастацкі дух ніколі не памрэ.
Не пахаваць яго пад курганамі,
Ня вычарпаць гадамі і вякамі.

Так мастацкі дух бясьсьмертны „ня вычарпаць гадамі і вякамі“, гэта дух крылаты, з ім толькі за песьняй у пагоню. У другім-жа сваім вершы Алесь Дудар як-быццам скардзіцца, жальбуе, што ня мае крыльляў мастацкага духу:

Каб былі, каб былі ў мяне крыльлі,
Я-б за песьняй паляцеў у пагоню.

Гэта падвойнасьць адчуваецца ў падыходзе і да тэматыкі:

Што капацца ў архівах стагодзьдзяў
Ды трывожыць заснуўшую цень...

І тут-жа чытаем нізку вершаў на гістарычныя тэмы, да якіх узяў такі эпіграф з Ул. Жылкі:

Мы любім даўныя паданьні,
Быліцы сівых песьняроў:
Няхітры іх апавяданьні
Аб справах зьбеглых ўжо гадоў.

Далей ён то поэта ўрбаністы, то поэта вёскі і г. д.

Гэта, памойму, у некаторай ступені дае нам пазнаць мастацкае „Я“ поэты. Яно яшчэ ня выкрышталілася ў нешта сталае і пэўнае, яшчэ яно стаіць на сонечным раздарожжы. Бо-ж і падвойнасьць яго ня ёсьць нешта ўзьведзенае ў стройную сыстэму, а часамі звычайная супярэчнасьць фактаў і мастацкіх прыёмаў.

У цэлым мастацкай вартасьці зборніку шкодзіць:

а) Жыцьцёвая няпраўда, як:

Беларусь мая ў фабрычных трубах...

або:

А Менск толькі бровы нахмурыў,
Ашчацініўся стрэламі труб.

б) Тандэтная агітацыя:

Хай дзяўчаты да раніцы гуляюць,—
Нам даклад сягоньня робіць аграном.
Скажа, як палепшыць ураджаі,
Як змагацца з сушай і дажджом.

в) Шаблённасьць:

І Ільліч прыжмурыў вока на сьцяне.

і г) Мітынгоўшчына:

Аднаму забітаму на зьмену
Стануць сотні новых змагароў.

Да ўсяго гэтага неабходна дадаць, што Алесь Дудар часамі неахайна адносіцца да лексыкону сваёй поэзіі. Мы вельмі часта ў яго спатыкаем русыцызмы, якія на глянцавітай паверхні яго поэзіі зьяўляюцца іржавымі шрамамі. Яны часамі псуюць вельмі і вельмі мілагучнасьць яго вершаў. Каб ня быць галаслоўным, вось узоры русыцызму: *нежная*, *ламаецца*, *заклубілся*, *тусклы*, *меткія*, *заглохла*, *прычаліў*, *мечацца*, *кайма*, *зарыдала* і інш.

Якія-ж з усяго павінны зрабіць вывады? А вось: Алесь Дудар, бясспрэчна, таленавіты поэта і беларускае прыгожае пісьменства чакае ад яго каштоўных скарбаў. Ёсьць надзея, што ён пры сваім творчым запале іх дасьць. Толькі адно: павінен больш уважліва даглядаць рунь сваёй творчасьці, бо ў адваротным выпадку сівер і вецер могуць вырваць яе маладое карэньне з нівы беларускага мастацкага слова.

Я. Кудзер.

# Кнігапіс

**Алесь Дудар — Шанхайскі шоўк**, *поэма. Выданьне ЦБ „Маладняка“ 1926 г. 36 стар. Цана 15 кап.*

Наша поэзія сягонешніх дзён вельмі багата вершамі, — затое-ж бедная больш буйнымі эпічнымі творамі. Што за апошні год зьявілася на сьвет? Раней напісаная, а цяпер апрацаваная поэма Якуба Коласа „Сымон Музыка“, „Карчма“ Міхася Чарота ды вось поэма А. Дудара „Шанхайскі шоўк“. Але кожная з гэтых поэм вельмі мала мае эпічнага элемэнту, яны ўсе абвеяны цёплым лірызмам. Не хачу я сказаць, што ў гэтым загана, ніколі не,— можа якраз наадварот: бо чым твор больш беспасрэдны, тым больш ён мастацкі. Твораў, у якіх выводзяцца тыпы, характары, у нас ёсьць мала, а іх чакаюць, яны патрэбны для чытача і для далейшага росквіту нашай літаратуры. Зьвернемся-ж зараз непасрэдна да Алеся Дудара. Алесь Дудар вельмі маладым прышоў у беларускую поэзію. Імя яго вядома Беларусі ўжо якіх пяць год назад. Калі ён быў яшчэ 15-16-гадовым юнаком, ужо тады пачынаў іграць на ліры і іграць з густам. У ім з першых яго песень мы адчулі поэту сягонешніх дзён. Ён ня мог, каб не захапіцца пафосам вялікай рэволюцыі. Яна ў яго творчасьці знашла сабе романтычна-публіцыстычнае ўвасабленьне. Ён ня мог, каб песьню сваю не абпролетарызаваць, ён таксама ня мог, каб не зьмяніць традыцыйныя і так характэрныя для беларускай поэзіі вясковыя мотывы на гарадзкія. Ня любіць яго песьня павольнасьці, ёй больш да спадобы рух, дынаміка, недарма-ж мо' і першы зборнік свой назваў „Беларусь Бунтарская“. Яго „Беларусь Бунтарская“ да мэты ня хоча ісьці скрозь туманоў сініх, а „Сонечнымі сьцежкамі“.

Уважліва перачытваючы зборнікі вершаў Алеся Дудара, мы заўважваем, што шмат ён працуе над тэматыкай. Ён перашоўшы ад сялянскай тэматыкі да гарадзкой, ставіць пытальнік над яе далейшым разьвіцьцём. І ў чым-жа ён знаходзіць вырашэньне? А вось: даволі беларускую поэзію ўціскаць у этнографічныя межы, для яе бацькаўшчынай павінна быць уся плянэта. Праўда, такі погляд, пры адным няўмелым кроку, поэзію можа прывесьці да выраджэньня,—яна можа стаць нічыйёй, на ўсёй плянэце будзе чужой. Але-ж не, для поэзі

А. Дудара сокамі яшчэ ўсё-ж зьяўляецца нацыянальная глеба, і за лёс яе пакуль што асаблівай боязі няма. Гэта ён пачынае ажыцьцяўляць і першай спробай зьяўляецца поэма „Шанхайскі шоўк". Сужэт для поэмы навеяны змаганьнем кітайскага пролетарыяту (кулі) за вызваленьне з-пад ангельскага капіталу.

Колькі іх, колькі!
І ўсе, як адзін,
І ўсе
толькі здань чалавека:
З голай сьпіны гэтак страшна
глядзіць
сьлед ангельскага стэка.

Вось гэта соцыяльная няволя і няпраўда натхнула напісаць Алеся Дудара сваю орыгінальную поэму ў беларускай літаратуры. Ці ўдалося А. Дудару справіцца з тэмай? Бязумоўна, ўдалося. Ён даў не дакучлівую агітацыю, а паказаў нам, хоць ня зусім вытрыманыя, але ўсё-ж характары людзей: з аднаго боку, комуністага кітайца Чы-Ванга, з другога — матроса ангельца Джона.

Па эмоцыянальна-мастацкай сіле мы не знаходзім твораў аб кітайскім пролетарыяце мацнейшых і ў расійскай літаратуры (Ціханава, Веры Інбер) за гэту поэму.

А. Дудар у ёй часамі дае нам даволі трапныя малюнкі і дзікай азыяцкай прыроды:

Ад Морока да Гімалаяў
дражняць неба жоўтыя скалы:
ой, ня раз там зубы ламалі
аб белыя косьці шакалы.

Але поплеч з такімі малюнкамі ёсьць вельмі і вельмі наіўныя, як:

Кітай—
гэта жоўтая такая краіна...

Ня гледзячы на сваю тэматычную орыгінальнасьць, гэта поэма куды вышэй стаіць за шмат якія ранейшыя вершы А. Дудара з боку мовы. Тут мы ўжо амаль не спатыкаем русыцызмаў і небеларускай сынтаксычнай пабудовы, а гэта ўсё надае поэме значны плюс у яе стылістычнай лёгкасьці. Гэта поэма нам кажа, што творчасьць Алеся Дудара з кожным днём становіцца больш цікавай і больш рознастайнай. У далейшым, для большай соцыяльна-мастацкай каштоўнасьці, А. Дудар павінен больш увагі зьвярнуць на псыхолёгічны бок сваёй творчасьці— і ўсё-ж не павінен забывацца, што на плянэце ён „сын маладой Беларусі". Каб творчасьць яго заўсёды ня губляла соцыяльна-мастацкай вартасьці, ён павінен памятаць цьвёрда адзін тэстамант, ім-жа выказаны ў поэме:

Хто сказаў, што ў сягонешні
дзень
Я краіне чужой малюся?..
*Не забыць мне нікалі, нідзе,*
*Што я сын маладой Беларусі.*

**Язэп Кудзер.**

# БІБЛІОГРАФІЯ

**Янка Купала. Збор твораў—том чацьвёрты.—Сон на кургане—Адвечная Песьня.—На папасе—Песьня аб паходзе Ігара—Галька (перакл).** *Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, 226 стар., ц. 2 р., Менск 1928 г.*

Шкада, што Янка Купала пад творамі гэтага тому не паставіў дат. Даты, якраз у гэтым выпадку, рэч вельмі паважная, бо яны дапамаглі-б устанавіць у некаторай ступені позу аўтара да сваіх твораў, а так надзвычай цяжка, напрыклад, гаварыць аб опэры „Галька“ Уладзімера Вольскага, якая, здаецца, у друку яшчэ нідзе ня была, і якую аўтар знайшоў магчымым, а мабыць, і патрэбным, выдрукаваць у 1928 г. Наогул цікава было-б ведаць, у якую гэта паласу свае творчасьці Янка Купала выбіраў гэткія творы для перакладу, калі мне здаецца, што яны ідуць ў разрэз з агульнай накіраванасьцю творчасьці поэты. А можа яна якраз адпавядае сучаснаму погляду поэты на поэзію, на шляхі яе разьвіцьця, можа, ён у ёй знайшоў блізкае да свайго сьветаадчуваньне? Акрамя таго, даты ў даным выпадку мелі-б значны ўплыў і на выбар пункту погляду рэцэнзэнта, а адсюль і на ацэнку гэтых твораў: ці зьяўляюцца, скажам, яны жывымі мастацкімі організмамі для сучаснага стану нашае поэзіі, ці можа яны ўсяго помнікі з гісторыі нашай літаратуры, дакумэнты з поэтычнага архіву народнага поэты?

Аднак, ня гледзячы на ўхіленьне аўтара ад датаваньня сваіх твораў, усё-ж вядома, што „Сон на кургане“, „Адвечная песьня“ і „На папасе“—творы нашаніўскай пары; „Песьня-ж аб паходзе Ігара“ зьявілася ў друку ў часы грамадзянскай вайны, пасьля Кастрычніка,—гэта, значыць, твор нашых дзён; магчыма, што і пераклад „Галькі“ зроблен у гады рэволюцыйнага дзесяцёхгодзьдзя.

Мы звыклі, з лёгкай рукі нашых крытыкаў, успрыймаць нашаніўскую пару і пару адраджэньня як сынонімы, ня гледзячы на тое, што ў словах нашаніўская пара куды менш зьместу, як у словах пара адраджэньня,—знаку роўнасьці ні ў якім выпадку мы сягоньня ставіць ня можам. Што такое нашаніўская пара? Пэўны кругабег часу (1906—1915), зьвязаны з выхадам газэты „Наша Ніва“, у які ажывіўся росквіт нашае поэзіі, якая, галоўным чынам, тужылася разьвязаць проблему нацыянальнага і соцыяльнага вызваленьня Бяссьпрэчна, што ў гэты кругабег палажан пачатак і пары адраджэньня ў шырокім разуменьні гэтага слова, але толькі пачатак. Нашаніўская пара замкнула сваё кола 1915 г., пара-ж адраджэньня толькі з Кастрычнікавай рэволюцыі перайшла ў новую фазу свайго сапраўднага росквіту, місія якога яшчэ далёка не закончана нават у БССР, ужо ня кажучы пра Заходнюю Беларусь.

Калі мы называем нашаніўская пара, дык адразу ў нашым ваччу з поэтаў вырысоўваецца Янка Купала, як быццам ён вышэй на галаву за ўсіх сваіх сучасьнікаў, па-за гэтай парою Янка Купала ўяўляецца менш выразна. Ды і ня дзіўна, што так: ён-жа быў на чале нашаніўскай пары, а разам з тым і раньняй пары беларускага літаратурнага адраджэньня. Лёс нашага адраджэньня іншы ад лёсу эўрапейскага адраджэньня, або, сьцісьлей кажучы, італьянскага. Ня буду я ўдавацца ў аналіз гэтага пытаньня ў рэцэнзіі, толькі адзначу, што для італьянскага літаратурнага адраджэньня характэрным зьяўляецца яго духоўная ўвязка з антычнай літаратурай, толькі яно не давала копій з клясычных аутэнтыкаў, а ўсяго ўспрыняло іхнюю меру апоэтызаваньня, унутраную гармонію, рэалістычныя тоны, жыцьцёвую мужнасьць, а сокі, якімі яна кармілася, былі з нацыянальнай глебы. Таксама характэрна для поэтаў італьянскга адраджэньня, што яны ў сваёй творчасьці бачылі не пабочныя мэты, а якраз творча-мастацкія; гэта дало ім магчымасьць стварыць і новыя формы, жанры, якія ляглі за аснову ўсяе эўропейскай поэзіі. Даволі назваць у лірычным жанры Пэтрарку, каб пераканацца, што эўропейская лірыка аж да Вэрхарна, а нават можа і пазьней, знаходзілася пад яго ўплывам.

Беларускае-ж літаратурнае адраджэньне свой лёс увязала не з антычнасьцю, не з эўропейскім адраджэньнем, за выключэньнем, праўда, М. Багдановіча, а з распадаючымся расійскім сымболізмам ды з другараднымі польскімі поэтамі, адсюль яго і малакроўнасьць. Яно не знайшло ў сабе мужнасьці паўтарыць дантаўскіх слоў аб Гомэры: „Шануйце найвялікшага поэту, які ўзьвіўся над другімі быццам арол“,—прыстасоўваючы ўжо іх да Гомэра, Дантэ і Шэксьпіра. Гэтымі словамі я ніколі не хочу сказаць, каб беларуская поэзія дваццатага стагодзьдзя ў сям'і эўропейскай была нейкай старамоднай, архаічнай. Якраз не, яна-б была самай малажавай ад усіх іх і самай жыцьцярадаснай, калі-б выцякала з антычных крыніц, а не з забросьнеўшых затонаў расійскай і польскай літаратур.

Тры орыгінальныя творы IV тому Янкі Купалы напісаны поэтам у гады распаду сымболізму, асабліва ў расійскай літаратуры, з якім Купала ўсё ж у нейкім сваяцтве быў і на зьмену якому ўжо ішоў

акмэізм, ды не за гарамі быў і футурызм. Праўда, Купалаўскі сымболізм—гэта не Салагубаўскі, не Вячаслава-Іванавага. Сонца ў Купалы не салагубаўскае сонца, няма ў Купалы і стольки містыкі, як у Вячаслава Іванавага, і ня бачыць ён цераз яе іскупленьня Беларусі. У Янкі Купалы рэалістычныя тоны ацяняе алегорычнасьць. Сьветаразуменьне Янкі Купалы не прадумана ў пляне сымболічным да яго лёгічнага канца, а таму яго і сьветаадчуваньне ўсё-ж афарбована больш у рэалістычныя тоны. Поэтыку сымболістых Янка Купала вызнаваў, дзякуючы чаму, культуру беларускага вершу ён узьняў надзвычай высока; гэта мы бачым і ў памянёных вышэй рэчах, асабліва з гэтага боку яны заслугоўваюць вялізарнай увагі і цікавасьці на'т і ў сучасны момант.

Янка Купала ў гэтых сваіх рэчах выступае, як драматычны поэта, але баюся я зараз прызнаць, што гэта Купалаўскі жанр. Можа, ён яму ня зусім удаўся таму, што гэтыя рэчы распрацованы ўсё-ж у пляне сымболічным, і таму ў іх страціўся найвялікшы гэрой, дзеючая асоба—чалавек; ён тут завэлюмаваны анімізмам і містыкай; можа быць, гэта давала большы ўзьлёт творчай фантазіі поэты, якая ў некаторых мясцох мяжуе з казачнасьцю, але гэта перашкодзіла разгарнуць дзею ў драматычнай роўніцы. Такі глыбокі зьмест і такі драматычны па сваёй пульсацыі мог быць аформлен у такіх яскравых і жыцьцёвых тонах, што можна было-б паўтарыць Гётэўскія словы пра Шэкспіра: „Нам здаецца, быццам мы стаім перад расхіненымі вялічэзнымі кнігамі самога лёсу“.

Праўда, у „Адвечнай песьні“ і „На папасе“ пераплялісія два пляны: містычны і рэалістычны, і вось, дзе пераважае другі, тыя месцы вышлі больш моцнымі па сваёй унутранай сіле і па сваім мастацкім пераконваньні. У „Адвечнай песьні“ гэта будуць месцы, прысьвечаныя працы і наогул, дзе словы ўложаны ў вусны чалавека—мужыка. XII песьня яе „На могілках“ узвышаецца па сіле дадзенага вобразу да IV і V сцэн I дзеі „Гамлета“ Шэкспіра, і толькі там—цень дацкага караля, а тут—цень беларускага мужыка, які хоча ведаць, патомкі яго як жывуць:

Ці песьні пяюць, ці як мухі
У цянётах гніюць павука?

І ўсё гаварэце мне, духі,
Што зроблена для мужыка.

„На папасе“—рэч самая аўтобіографічная з усіх, зьмешчаных у IV томе. Тут адразу пад незнаёмым пазнаём мы Янку Купалу, які гарue над праклятай доляй беларускага народу і які добра ўсё-ж разумее, як гэты народ, у такую цяжкую гісторычную пару, ацэньвае і ўспрыймае яго песьню:

3-ці падарожны:
І песьню так пяе працяжна!..

1-шы падарожны:
Душу, здаецца, рве яна.

2-гі падарожны:
О ці помніш усю чыста?

1-шы падарожны:
Пачатак помню ўвесь.

2-гі падарожны:
А я—сяродак галасісты.

3-ці падарожны:
А мне канец у вушы ўлез.

Мне зараз цяжка сказаць, на колькі даўгавечны гэтыя творы Купалы, які іх лёс чакае ў новыя эпохі; ці здолеюць яны там заіскрыцца сваім новым сьветам і жыцьцём і ці расчытаюць нашы патомкі ў іх тое, чаго мы сягоньня ня ўмеем расчытваць? Гэта пакідаю без адказу...

З перакладаў—два: „Песьня аб паходзе Ігара“ і опэра „Галька“. Першы пераклад надзвычай удалы як блізкасьцю свайго зьместу да аўтэнтыка, так і сваім мастацкім аформаваньнем. Якое мэтрычнае і строфічнае багацьце, а як магутна і вобразна гучыць беларускае мова! Затое нельга гэтага сказаць аб „Гальцы“. Шмат сустракаецца зваротаў мовы не беларускай, польскай, а таксама слоў і націскаў; ды і наогул дзіўна, чым магла зацікавіць гэта шляхецкая опэра Купалу? Твор сам па сабе маламастацкі,—няўжо тым, што Манюшка напісаў да яго музыку? Да рэчы, яшчэ некалькі слоў аб мове купалаўскіх орыгінальных рэчаў гэтага тому, хоць вельмі не хацелася-б мне аб гэтым гаварыць, але неяк становіцца няёмка, самому не па сабе, калі чытаеш у Купалы такі звароты:

Як фігуры выразáны,
Як бібулы маляваны.

Наогул скарочаны канчатак у прыметніках беларускай мове не па духу, а ў Янкі Купалы сустракаецца даволі часта.

Або ўжываньне такіх слоў: жалóсна, папсуе, разьменіць, балéсьне, бескарысьне, існéньня... ці: пахалі, абшырна, жалее, прыгадзіцца.. і ўрэшце, як фінал, такі радок: Кáлі бяда ў хаце.

Высноў я ніякіх рабіць ня буду, а ўсяго яшчэ зазначу на адно: калі зараз маладым нашым поэтам на кожным кроку крычаць—выкарыстоўвайце культурную спадчыну, дык я мушу ад сябе зазначыць: у першы чарод зьвярнецеся да поэзіі Янкі Купалы.

**Я. Плашчынскі**

# КНІГАПІС

**Якуб Колас.—Збор твораў з портрэтам аўтара і крытыка-біографічным нарысам У. Чаржынскага.** *Том першы—выпуск першы і другі. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва 1928 г.*

Першы выпуск пачынаецца, абмінаючы портрэт аўтара і крытыка-біографічны нарыс, вершам, які датаваны 1904 г., а другі выпуск канчаецца вершам 1927 г; такім чынам, перад намі амаль ня чвэрць стагодзьдзя творчай працы поэта ў лірычным жанры. Шмат да чаго абавязвае рэцэнзэнта, падыходзячы да ацэнкі такога поэтычнага докумэнту. Перад намі дзьве кнігі лірыкі поэта, за якім лічыцца гучная слава і зусім заслужаная.

На мой погляд дарэмна так многа полемізуе аўтар крытыка-біографічнага нарысу У. Чаржынскі ў пытаньні пэсымізму-оптымізму коласаўскай лірыкі, імкнучыся, у штоб там ні было, давесьці, хоць і літамонтажом, апошняе палажэньне.

Дарэмна аўтар узяў сабе гэта асноўную тэзу свайго нарысу, бо яно ўнутрана не выцякала з коласаўскай лірыкі, але аўтар хацеў знарок, зусім у непатрэбным, апраўдаць Коласа перад нашай сучаснасьцю як поэта з оптымістычным настроем. Гэта тэндэнцыйная ўстаноўка нарысу перашкодзіла аўтару зразумець творчую індывідуальнасьць нашага поэта. Таксама трэба пашкадаваць, што аўтар артыкулу крыху легкавата абходзіцца з тэрмінолёгіяй,—я маю на ўвазе нэо-романтызм эўропейскай літаратуры ў гады нашаніўства; мабыць, аўтар тэрмінам нэоромантызм хацеў аб'яднаць - імпрэсыонізм, сымболізм, а можа і футурызм у вадзін стыль. Мне здаецца, за імпрэсыонізмам, сымболізмам і футурызмам ужо ўстаноўлены больш-менш пэўныя і дакладныя паняцьці, і непатрэбна перад чытачом іх затушоўваць такім неакрэсьленым тэрмінам, як нэо-романтызм, падводзячы пад гэтую катэгорыю і лірыку Якуба Коласа,—бо-ж трэба было паказаць, што і Колас жыў адным жыцьцём з сучаснай яму эўропейскай літаратурай. Гэтым аўтар артыкулу нічога не прыпісаў хвалебнага Коласу, а толькі сам глыбока памыліўся. Я ўпэўнен, што Якуб Колас нічога агульнага ў нашаніўскі кругабег ня меў з тагочаснай эўропейскай поэзіяй, як у сэнсе тэматычным, так і ў сэнсе формальным, мастацкім у традыцыйным разуменьні гэтых катэгорый, гэта ніколькі ня зьніжае Коласа, як поэта, як мастака беларускага слова; дзякуючы гэтаму ён здолеў застацца больш орыгінальным нацыянальным беларускім поэтам і больш беспасрэдным.

Якуб Колас, з некаторымі агаворкамі можна сказаць, пачаў тварыць у дзіцячыя гады нашай поэзіі. Ён з Купалам першы загаварыў па-мастацку ў тую шчасьлівую пару, і ўсё, што яны гаварылі, было новым, цікавым і выдатным, бо трэба прызнаць, што гэта гаварылі сапраўдныя поэты, выдатныя творчыя індывідуальнасьці, таму і іхняя творчасьць здолела прабіцца з глыбінь на сьвет і выклікаць да творчага жыцьця новыя пясьнярскія пакаленьні.

Коласаўскі дыяпазон у лірычным жанры, трэба сказаць, ня вельмі шырокі. Ён поэта свайго часу з ціхай і глыбокай эмоцыянальнай натурай. Ён сьпяваў пра тое, што перажыў і адчуў, адсюль такая беспасрэднасьць яго творчасьці. Трэба адзначыць, што за 23 гады працы ў лірычным жанры Якуб Колас астаўся суцэльным. Вершы яго застаюцца формальна аднымі-ж і тымі, няма зьвіхаў, паваротаў да новых магчымасьцяй. Яны ўсе зьліваюцца ў адну засмучаную мэлёдыю, якая пасьля перэходзіць у больш шырокія, але ўсё-ж ціхія і павольныя хвалі яго, пакуль што ад інага ў нашай літаратуры эпосу. Лірычны жанр для Якуба Коласа гэта толькі ачышчэньне ў „сьвятое сьвятых" поэзіі.

Ня гледзячы на соцыяльную насычанасьць коласаўскай лірыкі, усё ж павінны прызнаць, што яму менш за ўсё ўдаюцца вершы на грамадзкія тэмы, яго тут творчы ўзьлёт зьніжаецца амаль да частушкі, але Якуб Колас, каб застацца поэтам ад жыцьця, а ён быў заўсёды такім, бязумоўна, ня можа адмовіцца надзенна-грамадзкай тэматыкі.

Строфічна лірыка Коласа беднаватая не таму, што пераважна чатырохрадковая строфіка, а таму, што Якуб Колас строфу неяк ня можа замкнуць, верш неяк пераліваецца з аднае строфы ў другую, адчаго траціцца гучнасьць коласаўскай лірыкі.

Колас, як ніхто другі з беларускіх поэтаў, зьяўляецца народным у сэнсе сялянскім толькі яго дарэволюцыйная сялянская тэматыка для нашых дзён страціла асткова сваю актуальнасьць.

Я. Плашчынскі

**Кузьма Чорны. Зямля, роман у трох частках, балонак 353, *цана 1 р. 25 к. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск, 1928 г.***

Роман, як жанр, у нашай мастацкай літаратуры, можна сказаць, толькі нараджаецца, зьяўляецца толькі навінкай; вось чаму і чытачу ён яшчэ ня спрыкрыў, чытач яго любіць. Зьяўленьне роману, проста як тоўстай кніжкі, і то чытач не адкідвае, а сквапна працягвае да яго свае рукі; ён яшчэ ня шукае ў романе мастацкага эквіваленту, ён падыходзіць да яго па звычайнаму, па будзённаму,—проста, каб правесьці за кнігай свой вольны час, якога ён мае, праўду кажучы, шмат. Яго яшчэ ня цікавіць конструкцыя роману, усёроўна, якім-бы ён ні быў, а ў нашых умовах будзе нечым новым; яго яшчэ таксама ня цікавяць і спосабы пабудовы гэтай конструкцыі. Вось чаму і карысталіся посьпехам у нашага чытача ўсе нашы романы, хоць некаторыя з іх з цягам часу і зусім забудуцца, адамруць. Але ня гэткі лёс чакае роман Кузьмы Чорнага „Зямля", бо ён сапраўды зьяўляецца першым нашым романам высокай мастацкай вартасьці.

„Зямля"—роман глыбока социяльны, і социяльнасьць яго не старая, а новая—сялянская. У ім паказана сялянскае жыцьцё з розных бакоў і ў розных абставінах. Паказана нараджэньне новага ў сялянскім быце, абуджэньне грамадзкай сьвядомасьці, спадчынасьць беднасьці, якая іншчэ і цяпер некаторых прагне ўтрымаць у сваіх кіпцях. Але поплеч з гэтым паказаны і прасьветы гэтай беднасьці; хоць бываюць у жыцьці вялікія ўтраты, якія выклікаюць гора, але ёсьць шмат і радасных часін.

Аўтар паказаў нам сваіх гэрояў у вёсцы, а ня ў горадзе, у гэтым суцэльнасьць іхніх натур, не адчуваецца раздвоенасьці характару; гэрої любяць і жывуць зямлёю. Хоць у ваднэй-дзьвюх вёсках, мястэчку, але аўтар здолеў разгарнуць дзею роману ў псыхолёгічнай роўніцы. Праўда, аднаго стрыжня, вакол якога адбывалася-б дзея, як быццам і няма, ён не выпірае, але ўсё-ж мы адчуваем, што Зямля—гэта нейкі цэнтр, асяродак, да якога дзеяньне ўнутраной сілай прыцягваецца, гэта-ж зьяўляецца адным з спосабаў конструкцыі роману. „Зямля" складзена з паасобных новэль—разьдзелаў; амаль кожны разьдзел дае закончаны мастацкі вобраз, і ў гэтым яе композыцыя.

Аўтар адмовіўся ад апавядальнай манеры, замяніў яе дыялёгам, што набліжае роман да рытму нашых дзён. Дзякуючы гэтаму спосабу, аўтар амаль ніде не гаворыць за сваіх гэрояў, а ўсюды яны самі і асабліва важна і дадана тое, што кожны з іх умее гаварыць па-свойму, адчуваеш іх жывымі людзьмі. Ім аўтар не завязаў роту, не ўвіхаецца за іх усё сказаць і за іх-жа прагаласаваць, як гэта некаторыя робяць. Адсюль ужо выцякае і тое, што аўтар вонкава не стараецца нарысаваць сваіх гэрояў, але мы іх добра помнім у твар, яны яго нам самі паказалі—выявілі.

Прачытаўшы роман, адчуваеш сьвежую сочную беларускую мову і глыбокі ўнутраны лірызм, асабліва ў пэйзажных малюнках нашай восені, адчуваеш магутны пульс зямлі, за якую ўхапіўся аберуч і слухае цэлам і душою беларускі селянін.

Вельмі ўзрушвае сьмерць Юркавай маткі, але крыху расхалоджвае момант зьбіваньня труны, бо ён крыху расьцягнены, і мы чыталі пра гэта ў ранейшым апавяданьні нашага пісьменьніка.

У романе паказана здаровае каханьне беларускай сялянскай дзяўчыны і хлопца, бяз эротычных смакаваньняў яго самім аўтарам.

Мне выдаліся крыху не маляўніча зробленымі зарысоўкі новага сучаснага вясельля Ганны, а таксама і Алеся. Тут аўтар адчуваецца халаднаватым, як-бы ад нечага знарок ухіліўся, ці нешта знарок дадаў—модэрнізаваў рэчаіснасьць.

Калі пачатак трэцяй часткі можа крыху разхалодзіць, дык затое канец яе, а значыць і роману, запальвае здаровым імкненьнем да творчай працы.

**Я. Плашчынскі**

**Янка Купала. Збор твораў з крытычна-біографічным нарысам. Том першы. Бал. 381.** *Цана 2 р. 25 к. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск 1928 г.*

Крытычна-біографічны нарыс Жылуновіча, напісаны па-таварыску, цёпла, мабыць усяго гэта аўтар нарысу і меў на ўвазе. Тыя абзацы нарысу, у якіх аўтар выказваецца ў пляне літаратурна-тэорытычным, вышлі надзвычай наіўнымі і блытанымі. Каб пераканацца ў гэтым, вазьмеце і прачытайце, хоць-бы абзацы, прысьвечаныя трактоўцы расійскага сымболізму і купалаўскага.

Жылуновіч вобраз Купалы паказаў праз свае люстра, але мабыць ня ведаў, што яго люстра надта крывіць.

Калі крытык піша артыкул пра творчасьць выдатнага поэты, дык найчасьцей бывае так, што ён сваім стылем, манерай сваіх выказваньняў пападае ў эмоцыянальны і слоўнікавы тон твораў поэты, але Жылуновіч ня здраѕіў сабе ў гэтым. Артыкул напісаны ў стылі жылуновічаўскіх (Цішкі Гартнага) твораў. Калі чытаеш крытычна-біографічны нарыс, дык адчуваеш, што аўтар яго творчасьць Купалы не патурбаваўся вывучыць, а пісаў па-таварыску. Хоць нас і вельмі абурае, але ня ѕівіць пасьля гэтага канцоўка нарысу:

І даданая ў наступным (?) да усяго ім напісанага зложыць яму

„...памятник нерукотворный“,

да якога

„...не зарастет народная тропа“.

Закончыць нарыс пра творчасьць поэты чужымі радкамі ня зусім прыгожа; у Купалы па мастацкай сіле можна было-б знайсьці не слабейшыя радкі, але чамусьці Жылуновіч не захацеў гэтага зрабіць.

Пераходзячы непасрэдна да характарыстыкі купалаўскай поэзіі гэтага тону, я дазволю зрабіць сабе адну агаворку. Шкада, што Купала, падрыхтоўваючы да выданьня першым томам „Жалейку“ і „Гусьляр“, не зрабіў, асабліва над вершамі „Жалейкі“, апошняй аўтарскай рэдакцыі,—я разумею аўтарскай творчай рэдакцыі. Крыху ѕікаватымі выдаюцца невядома? (га) „рэд“ заўвагі да тэксту некаторых вершаў, бо ніѕе на тытульным аркушы не аднатавана, што поўны збор твораў Янкі Купалы выхоѕіць пад такой-та „рэд“.

Хоць рэцэнзія і не павінна ставіць перад сабою пытаньняў дасьледчага парадку, але ўсё-ж у гэтым выпадку пытаньне гэнэзісу купалаўскай лірыкі мы павінны закрануць.

„Жалейка“ і „Гусьляр“ гэта першыя зборнікі лірыкі нашага поэты, дык цікава тут устанавіць нам купалаўскіх літаратурных родзічаў. Па лініі беларускай літаратуры можна-хіба адну Цётку, па лініі польскай—Канапніцкую, украінскай—Шэўчэнку, расійскай—Некрасава, Кальцова—мы на гэта маем падставы, як у разрэзе ідэолёгічным, так і формальным; але гэтыя ўсе лініі хутка сьціраюцца, і Купала становіцца сам сабою, орыгінальнай творчай індывідуальнасьцю. Жывою крыніцаю купалаўскай поэзіі—мужычая Беларусь на шляху адраѕэньня; гэта крыніца незабросьнела, а прабілася на сьвет да жыцьця з сваім найвялікшым песьняром Купалам.

Купала прышоў у нашу поэзію не з позай поэты, але з поэтам у душы, які пытаўся ў сваіх песень:

Песьні мае, песьні!
Смутку майго ѕеці,
Калі-ж час ваш прыѕе
Весела запеці?

Ён прышоў нясьмелым вясковым юнаком, якому дарага было да сьлёз усё блізкае і роднае. Ён шукаў для сябе і адпаведнага вобразу, праз які можна было-б як найшчыльней з гэтым родным і блізкім зьліцца, яму хацелася быць варабейкам з-пад Гайны. Але гэта так было на пачатку (чытай верш „Я ня сокал“) у „Жалейцы“. У „Гусьляры“ Янка Купала ўжо магутны, як сокал і вецер:

І вецер, і сокал, і я—
Сыны аднэй долі жыцьця;

і далей

Як вецер, свабодны мой дух,
Хоць гора цягаю ланцуг.

Янка Купала пісаў пра тое, што глыбока перажыў сваім нутром, вось чаму ён так беспасрэдна, праўѕіва, сьмела і гнеўна ўпісаў у нашу поэзію гімны мужычай нядолі.

Проста ня верыш, і жах бярэ, што з-пад пяра маладога поэты, за плячыма якога была такая бедная літаратурная традыцыя

у тыя часы мог зьявіцца такі пякучы гімн эпохі беларускай няволі,—хоць яго кожны ведае. але не пашкодзіць яшчэ раз прывесьці:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У вагромністай такой грамадзе?

— Беларусы.

А што яны нясуць, на худых плячох,
На нагах ў крыві, на нагах ў лапцёх?

— Сваю крыўду.

А куды-ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды-ж нясуць на паказ сваю?

— На сьвет цэлы

А хто гэта іх, не адзін мільён,
Крыўду несьць навучыў, разбудзіў іх сон?

— Бяда, гора.

А чаго-ж, чаго захацелася ім,
Пагарданым век. ім, сьляпым, глухім?

— Людзьмі звацца.

У „Жалейцы“, поплеч з такімі сапраўднымі пэрламі поэзіі, ёсьць і слабыя вершы, у якіх поэта яшчэ часамі ня можа справіцца з рытмічнымі хвалямі і ўпадае ў звычайную пісаніну, для прыкладу дзьве страфы з вершу „Да дзяўчатак“:

Бачу, так здаваецца,
Што мне бедаку
Таго штось жадаецца,
Што і галубку.

Адну ненаглядачку
За жонку вазьму,
Тады можа радачку
Дам гору свайму.

Такой беднай інструмэнтоўкі мы ўжо бадай не знаходзім у „Гусьляры“; у гэтым зборніку наш поэта сягнуў вельмі далёка: культуру, гучнасьць беларускага вершу ўзьвёў на вышыню поэзіі багоў, калі-б такая магла быць:

Гэй, гусьляр, гусьляр!
Ты удар, удар
Па струнах, званах,
Дай нам з песен дар,
Дум вялікіх чар.
К сонцу зорны шлях,
Дай гусьляр, гусьляр!

У гэтым сваім другім зборніку Янка Купала пашырыў кола і свае тэматыкі; у ім ужо адчуваецца, што нашага поэту зачапіла гарадзкая, кніжная культура, але ўсё-ж ён заставаўся праўдзівым сабе, гэта ня выветрыла з яго наіўнасьці сапраўднага поэты: адчуваецца знаёмства з расійскім сымболізмам.

„Жалейка“ і „Гусьляр“ падрыхтоўваюць і ўводзяць нас у клясычную пару купалаўскай лірыкі; гэта яны нам узьнімаюць заслону ў другі том збору твораў, у які ўвайшоў зборнік „Шляхам жыцьця“. Пра гэты том спадзяюся напісаць у бліжэйшыя часы.

**Я. Плашчынскі**

**Сяргей Дарожны — Васільковы россып — вершы. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва,** *бал. 83. ц. 85 к.*

Сяргей Дарожны як чалавек, так і поэт яшчэ малады; гэта зялёная маладосьць адчуваецца ва ўсім яго „Васільковым россыпе", але ў ёй усё-ж ёсьць шмат сочнасьці, ад якой не адкрасуе поэзія пустацьветам, ня зьвяне, а прынясе, магчыма, плён, які нас усіх усьцешыць.

Калі вы прачытаеце „Васільковы россып", дык вам цяжка будзе ўспомніць з яго які-небудзь верш; яны ўсе зьліліся ў адну эмоцыянальную, але нявыразнага гучаньня мэлёдыю. Затое, калі вы чыталі гэтыя вершы, дык некаторыя з іх сваёй непасрэднасьцю, сваім лірызмам былі вам блізкія, і вы іх любілі і перачытвалі, а ўжо гэта асабліва шмат што гаворыць, калі вы будзеце рабіць поэтычную ацэнку зборніку.

Праўда, васількі Дарожнага часта калыша вецер з чужых палёў, і хвалі іх пераліваюцца падслуханым шумам. Але гаворачы сур'ёзна, які поэт пасьля Гомэра не прыслухоўваўся і не насьлядаваў другіх, калі нават такі як Дантэ і то выбраў сабе Вергілія ў правадыры, заблудзіўшыся ў страшным лесе поэзіі і жыцьця; або такія, як Гюі-дэ-Мопасан, Ромэн Ролян, адкрыта называюць сваімі настаўнікамі Тургенева і Л. Н. Талстога.

Аб чым-жа шуміць „Васільковы россып"? А перш за ўсё аб тым, што С. Дарожны—

вясковы юнак з беларускага Палесься, якога жыцьцё выхапіла з вёскі і апролетарызавала ў горадзе, але які яшчэ ўнутрана жыве вясковымі бярозкамі і клёнамі, вясковай зімою з сьнегам па калена.

У „Васільковым россыпе“ нам толькі ўсьміхаюцца, але не гараць, вочы Дарожнага каханьнем. Яго каханьне, як і некаторых другіх, у значнай ступені поза на літаратурнае каханьне суседзяў. Але ў гэтым не вялікая, як кажуць, бяда. Поза рыцарскай поэзіі каханьня у элегантнай сонэтнай форме ў свой час абышла ўсе эўропейскія літаратуры.

Наш поэта не стаіць з боку ад жыцьця; ён так-жа задушэўна і шчыра, як пра свае дзіцячыя гады, сваё каханьне, сваю радасьць і сум, сьпявае песьні і краіне.

Добры дзень, краіна дарагая,
Добры дзень, вазёры і лясы,
Вам сягоньнячы па ўсіх курганах
Распусьціла сонца валасы!

ён хоча—

Каб і Нёман сіні, Вісла і Нява
Разьліліся ў сінюю паводку,
Для аднэй комуны хваляваць
Даль бязьмежную у вокнах.

Ад таго я ў радасным убраньні,
Аб усім забыўшыся, пяю
Пра вясну, краіну і змаганьне,
Пра жыцьцё і моладасьць сваю!

Апошняя страфа вельмі ўдала характарызуе творчасьць Дарожнага, мы да яе павінны ўважліва аднесьціся і дапамагчы ёй акрыяць.

Некаторыя вершы Дарожнага расьцягнены і ад гэтага часамі шмат трацяць. Пры ўстаноўцы на напеўнасьць ня варта ўжываць перабойных рытмаў, калі яны ня маюць за сабой мотываванага апраўданьня, якія мы знаходзім у „Васільковым россыпе“.

Апрача напеўнасьці Дарожны будуе сваю поэзію на вобразнасьці, мэтафорычнасьці, і ў гэтым дачыненьні яна мае шмат трапнасьці, а нават і сьвежасьці, вось некаторыя прыклады:

1. Ў рэчку ўпала лясоў галава,
А мая асмуглелаю стала.
2. Як туманы скачуць белыя з-за
гаю.
3. І як вечар—з пустымі рукамі
Перавулкам вяртаўся дамоў.
4. Каб цяпер можа крыўду горкую
Піць гладышкам сіняга дня.
5. Я іду стрэць дзяўчыну прыгожую
З навальніцаю русых валос і інш.

Дарожны поэт малады, які ў поэзіі убачыў шмат сьцежак вузкіх і шырокіх.

Пажадаем-жа яму, каб ён хутчэй сабе выбраў з гэтых сьцежак адну, але сваю.

**Я. Плашчынскі**